Матэрыялы ў дапамогу настаўніку
беларускай мовы і літаратуры

# Арганізацыя навукова-даследчай дзейнасці ў школе

*Падрыхтаваны раённым вучэбна-метадычным кабінетам аддзела адукацыі Добрушскага райвыканкама на аснове матэрыялаў кандыдата філалагічных навук, дацэнта кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры Інстытута журналістыкі БДУ Драбеня Ф.В.*

## *Тэрміны тэмы:*

***- Навукова-даследчая дзейнасць*** *– від дзейнасці, накіраваны на атрыманне* ***новых*** *аб’ектыўных навуковых ведаў.*
***- Вучэбна-даследчая дзейнасць*** *– дзейнасць, галоўнай мэтай якой з’яўляецца* ***адукацыйны вынік****, накіравана на навучанне дзяцей, развіццё ў іх даследчага тыпу мыслення.*

## *Этапы даследчай работы:*

*I. Падрыхтоўка да правядзення даследавання;*
*II. Правядзенне даследавання;*
*III. Афармленне работы;*
*V. Абарона вынікаў даследавання.*

## *Падрыхтоўка да правядзення даследавання:*

*- вызначэнне аб’ектнай вобласці (аб’екта, прадмета даследавання);*
*- выбар тэмы, праблемы, вызначэнне актуальнасці;*
*- вывучэнне літаратуры;*
*- фармулёўка гіпотэзы;*
*- фармулёўка мэты, задач;*
*- вызначэнне метадаў даследавання;*
*- напісанне работы.*

## *Вызначэнне тэмы навуковай работы залежыць ад некалькіх фактараў:*

*- узроўню падрыхтаванасці вучня;*
*- цікавасці да пэўнай з’явы ці аўтара (твора);*
*- актуальнасці той ці іншай тэмы на сённяшні час;*
*- умення крытычна асэнсоўваць матэрыял з розных крыніц;*
*- умення ясна і дакладна выкладаць свае думкі;*
*-узроўню распрацаванасці той ці іншай тэмы.*

## *Выбар тэмы:*

*- цікавая для вучняў;*
*- цікавая для настаўніка;*

*- даступныя ўмовы рэалізацыі тэмы;*
*- правільная фармулёўка тэмы.*

**_ТЭМА ДАСЛЕДАВАННЯ_**

*(Аналіз тэм мінулых гадоў)*

## *Магчымыя тэмы:*

***Мовазнаўства***

1. *Спосабы ўтварэння эмацыянальнай лексікі ў беларускім фальклоры (газеце, часопісе і г.д. )*
2. *Дзеясловы з суфіксамі –ірава / -ырава, -ава / -ява ў сучаснай беларускай мове (на прыкладзе.......)*
3. *Асаблівасці перакладу вершаў з замежных моў на беларускую.*
4. *Моўна-стылістычныя асаблівасці тэкстаў песень беларускамоўных гуртоў.*
5. *Камп'ютэрны жаргон у мове сучаснай беларускай моладзі.*
6. *Моўная норма і адхіленне ад яе (ў сродках масавай інфармацыі, газетах і інш.).*
7. *Страты і знаходкі тапаніміі маёй мясцовасці.*
8. *Запазычанні з заходнееўрапейскіх моў у беларускай мове канца XX – пачатку XXI стагоддзяў.*
9. *Рэкламны тэкст і яго ўплыў на слухача.*
10. *Новыя словы ў лексіцы беларускай мовы (на матэрыяле газет, часопісаў і інш.).*
11. *Жаргонная лексіка ў мове сучаснай моладзі.*
12. *Невярбальная мова зносін і яе суадносіны з традыцыйнымі моўнымі сродкамі.*
13. *Тэкст сучаснай папулярнай лірычнай (эстраднай, рок, поп і інш.) песні ў камунікатыўным і стылістычных аспектах.*
14. *Сацыяльны дыскурс масавай камунікацыі (на матэрыяле ток-шоу).*
15. *Сучасны беларускі дэтэктыў: арганізацыя тэксту.*
16. *Моўныя сродкі і іх рэалізацыя ў беларускамоўных ефармальных іжасабовых зносінах (на матэрыяле Інтэрнэт-дзённікаў).*
17. *Моўныя паводзіны ўдзельнікаў рэаліці-шоу: камунікатыўны аспект.*
18. *Сінтаксіс дыялагаічнага маўлення.*
19. *Сродкі міжфразавай сувязі ў паэтычным тэксце.*
20. *Дзіцячыя забаўлянкі і калыханкі як тэкст.*

***Літаратуразнаўства***

1. *Маральна-дыдактычная накіраванасць і камізм беларускіх інтэрмедый*
2. *Асаблівасці стылю міцкевічаўскіх балад (рамансаў, санетаў, паэм). Творы на выбар вучня.*
3. *Міфалагемы і сімвалы ў паэтычных творах Максіма Багдановіча.*
4. *Фантастычнае і прыгодніцкае ў аповесці Лабірынты" Вацлава Ластоўскага.*
5. *Традыцыі К.Крапівы ў сучаснай драматургіі.*
6. *Лірычная мініяцюра ў творчасці Я. Брыля, яе эстэтычная адметнасць.*
7. *Інтэртэкстуальнасць твораў пра сучаснасць (на матэрыяле твораў І. Шамякіна)*
8. *Вобраз маці ў творчасці Р. Барадуліна як духоўны цэнтр нацыянальнага свету.*
9. *Метрыка-рытмічная арганізацыя сучаснай паэзіі (на прыкладзе 2-3 аўтараў).*
10. *Адлюстраванне чарнобыльскай трагедыі ў творах сучаснай беларускай літаратуры.*

*11.Пераемнасць традыцый у паэзіі, прозе, драматургіі (на прыкладзе 2-3 аўтараў)*
*12.Ідэйна-мастацкая канцэпцыя зборніка “Прайсці праз зону”.*
*13.Чытач і глядач: суадносіны драматургічнага тэксту і пастаноўкі на сцэне тэатрам.*
*14.Канцэпт “смех” у беларускай літаратуры.*
*15.Архетыпы ў творах пісьменнікаў.*
*16.Беларуская літаратурная прытча.*
*17.Загалоўкі ў творчасці пісьменніка.*
*18.Патрыятычныя ідэі ў творчасці маладых беларускіх паэтаў.*
*19.Евангельскія матывы ў прозе У. Караткевіча.*
*20.Тэма кахання ў творчасці пісьменніка.*
*21.Міфатворчасць сучасных беларускіх паэтаў*
*22.Актывізацыя ідэйна-творчых пошукаў, пашырэнне выяўленчых магчымасцей беларускай прозы 80—90-х гг.*
*23.Стан сучаснай беларускай драматургіі, яе жанрава-стылёвыя асаблівасці развіцця.*
*24.Матывы лірыкі Я.Купалы ў творчасці сучасных кампазітараў і спевакоў.*

***Метадалогія навуковай работы***
*Актуальнасць;*
*Мэта;*
*Задачы;*
*Гіпотэза;*
*Аб’ект;*
*Прадмет.*

## *АКТУАЛЬНАСЦЬ*

***Актуальнасць работы*** *– выяўленне ступені распрацаванасці тэмы, вызначэнне месца даследавання сярод падобных у дадзенай вобласці.*
***Паказчык актуальнасці*** *– наяўнасць праблемы, якая выяўляецца падчас вывучэння навуковай літаратуры, практычнай работы з інфармацыяй.*

*Напрыклад,* ***АКТУАЛЬНАСЦЬ ДАСЛЕДАВАННЯ:***
***- да тэмы “Міф і беларуская літаратура XIX стагоддзя”***
*Айчыннае літаратуразнаўства дагэтуль даволі асцярожна звяртаецца да асэнсавання міфалогіі ў беларускай літаратуры. Міф вельмі часта лічыўся чымсьці несапраўдным. Часам ён атаясамліваўся з цемрашальствам і забабоннасцю, якія толькі абцяжарваюць разуменне спецыфікі з’яў, што характарызуюць развіццё літаратурнага працэсу. Разам з тым, менавіта самыя архаічныя пласты чалавечага мыслення дазваляюць вылучыць найбольш трывалыя памкненні чалавечай душы ў зменлівым і часта варожым для чалавека свеце.*
***- да тэмы “Мова рэкламных слоганаў”***
- *абумоўлена патрэбай асэнсавання моўных з’яў у рэкламе, стварэнне на гэтай аснове канцэпцыі дынамічнага і наватарскага развіцця нацыянальнай рэкламы і спрыяльнай атмасферы для развіцця рэкламы па-беларуску;*
- *Даследаванне рэкламных слоганаў з’яўляецца важнай праблемай у сучасны мовазнаўстве, перспектыўным накірункам, паколькі дадзеная праблема вывучалася фрагментарна і сёння адсутнічае цэласная праца па мове рэкламы па-беларуску.*

***<u>Мэта</u>*** *– канчатковы вынік, якога хоча дасягнуць даследчык.*

***Фармулёўка мэты:***

- *выявіць...*
- *устанавіць...*
- *абгрунтаваць...*
- *удакладніць...*
- *распрацаваць...*

*Напрыклад,* ***МЭТА ДАСЛЕДАВАННЯ:***

***- да тэмы "Трансфармацыя вобраза жанчыны ў беларускай прозе ХХ стагоддзя"***

☐ *з'яўляецца вывучэнне рэпрэзентацыі і трансфармацыі вобраза жанчыны ў нацыянальнай прозе ХХ стагоддзя.*

***- да тэмы "Паэтыка рамантызму ў аповесці У. Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха"***

☐ *выявіць рысы рамантызму як адметнай мастацка-стылёвай плыні, вызначыць характэрныя рысы аўтарскага стылю і мастацкія асаблівасці твора.*

***-да тэмы "Жанрава-стылёвыя тэндэнцыі беларускай драматургіі канца ХХ – пачатку ХХІ стагоддзяў"***

*вызначыць жанрава-стылёвую спецыфіку драматургічных тэкстаў канца ХХ – пачатку ХХІ стагоддзяў і сістэматызаваць іх з наступным вылучэннем вядучых жанрава-стылёвых тэндэнцый у развіцці сучаснай беларускай драматургіі.*

***<u>Задача</u>*** *– выбар шляхоў і сродкаў для дасягнення мэты:*

- *выявіць...*
- *устанавіць...*
- *абгрунтаваць...*
- *удакладніць...*
- *распрацаваць...*

*Напрыкла,* ***ЗАДАЧЫ ДАСЛЕДАВАННЯ:***

***-да тэмы "Максім Багдановіч як стваральнік паэтычнай нацыянальнай традыцыі"***

☐ *вызначыць спецыфіку ўзаемадзеяння М. Багдановіча з "нашаніўскім" сацыяльна-культурным і ідэйна-мастацкім кантэкстам праз аналіз паэтычнай спадчыны;*

☐ *раскрыць значэнне ідэй і творчых напрацовак М. Багдановіча для ўмацавання мастацкіх і інтэлектуальных асноў беларускай паэтычнай традыцыі.*

***-да тэмы "Паэтыка рамантызму ў аповесці У. Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха"***

☐ *даць канцэптуальную характарыстыку рамантызму як адметнай плыні еўрапейскай літаратуры і мастацтве, выявіць праявы рамантызму ў беларускай літаратуры;*

☐ *паказаць трансфармацыю беларускага рамантызму (ХІХ і ХХ стагоддзі);*

☐ *выявіць стылеўтваральныя элементы рамантычнай творчасці, адметнасць наватарства, мастацкіх прыёмаў і сродкаў пры стварэнні твора;*

☐ *раскрыць эстэтычны пошук у рэчышчы рамантызму як плённы эксперымет, важны складнік літаратурнага працэсу, які мадэляваў далейшае развіццё эпічнага роду літаратуры на беларускай глебе.*

## *ГІПОТЭЗА*

- ☐ *Павінна быць правяральнай;*
- ☐ *Змяшчаць меркаванне;*
- ☐ *Адпавядаць фактам.*

*Дапусцім, што...*
*Магчыма, што...*
*Пры ўмове, што.*

## *Аб'ект даследавання:*

***Аб'ект даследавання – гэта пэўны працэс ці з'ява, што спараджаюць праблемную сітуацыю.***
*Аб'ект – носьбіт праблемы.*

***Да тэмы "Міф і беларуская літаратура XIX стагоддзя"***
*Аб'ектам даследавання з'яўляецца беларуская літаратура XIX ст.*

***Да тэмы "Максім Багдановіч як стваральнік паэтычнай нацыянальнай традыцыі"***
*У якасці аб'екта даследавання вылучаецца нацыянальная паэтычная традыцыя на этапе яе станаўлення, якая матэрыязавалася ў мастацкіх, а таксама ў літаратурна-тэарэтычных, крытычных, публіцыстычных тэкстаў беларускіх аўтараў (Цётка, Я. Купала, М. Багдановіч, А. Гарун і інш.)*

***Да тэмы "Трансфармацыя вобраза жанчыны ў беларускай прозе XX стагоддзя"***
*Аб'ектам даследавання сталі празаічныя творы Міхася Зарэцкага, Кузьмы Чорнага, Івана Мележа, Васіля Быкава.*

## *Прадмет даследавання*

***Прадмет даследавання –** гэта канкрэтная частка аб'екта, унутры якога адбываецца пошук.*

*Напрыклад**, ПРАДМЕТ ДАСЛЕДАВАННЯ:***
***-да тэмы "Міф і беларуская літаратура XIX стагоддзя"***
***Прадмет даследавання –** хрысціянскі дыскурс сацыяльнай міфатворчасці ў беларускай літаратуры.*
***-да тэмы "Максім Багдановіч як стваральнік паэтычнай нацыянальнай традыцыі"***
*Прадмет даследавання – сукупнасць літаратурна-тэарэтычных і эстэтычных ідэй Максіма Багдановіча, іх праявы ў функцыянаванні нацыянальнай паэтычнай традыцыі.*
***-да тэмы "Трансфармацыя вобраза жанчыны ў беларускай прозе XX стагоддзя"***
*Прадметам даследавання з'яўляецца трансфармацыя літаратурнага вобраза беларускай жанчыны ў нацыянальнай прозе на працягу XX стагоддзя. Паралельна прааналізаваны найбольш значныя творы, якія аказалі ўплыў на фарміраванне вобраза жанчыны.*

## *МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ:*

- ☐ *тэарэтычныя;*
- ☐ *эмпірычныя;*

- ☐ *філасофскія;*
- ☐ *агульнанавуковыя;*
- ☐ *спецыяльныя;*
- ☐ *гістарычныя;*
- ☐ *сацыялагічныя;*
- ☐ *колькасныя і інш.*

***Метад*** *– спосаб дасягнення мэты даследавання*

*1) Тэарэтычныя метады*
*-мадэліраванне;*
*-абстрагіраванне;*
*-аналіз і сінтэз;*
*-шлях ад абстрактнага да канкрэтнага.*
*2) Эмпірычныя метады*
*-назіранне;*
*-параўнанне;*
*-эксперымент;*
*3) Матэматычныя метады*
*-статыстычныя метады.....*

***СПОСАБЫ ДАСЛЕДАВАННЯ:***

- ☐ *аналіз;*
- ☐ *сінтэз;*
- ☐ *аналогія;*
- ☐ *ідэалізацыя;*
- ☐ *індукцыя,*
- ☐ *дыдукцыя;*
- ☐ *абстрагаванне і інш.*

***ПРЫЁМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ:***

- ☐ *класіфікацыя;*
- ☐ *дыферэнцыяцыя;*
- ☐ *мадэляванне;*
- ☐ *тыпізацыя і інш.*

## *СТРУКТУРА ДАСЛЕДАВАННЯ*

*УВОДЗІНЫ*
*АСНОЎНАЯ ЧАСТКА*
*РАЗДЗЕЛ І.*
*Тэарэтычны раздзел.*
*РАЗДЗЕЛ ІІ.*
*Аналіз моўных з’яў ці твора.*
*ЗАКЛЮЧЭННЕ*
*ЛІТАРАТУРА*

*ДАДАТКІ*

*Напрыклад,*

***-да тэмы “Паэтыка рамантызму ў аповесці У. Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”***

*Уводзіны*

*РАЗДЗЕЛ І. Рамантызм і рэалізм у творчасці У.Караткевіча*

*1.1. Паняцці “рамантызм” і “рэалізм” у літаратуразнаўстве*

*1.2. Рамантызм і рэалізм у творах*

*У.Караткевіча*

*РАЗДЗЕЛ ІІ.*

*2.1. Ідэі і вобразы ў аповесці*

*У. Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”*

*2.2. Мастацкія асаблівасці аповесці*

*У. Караткевіча*

*3. Заключэнне*

*4. Літаратура*

*5. Дадатак А*

## *УВОДЗІНЫ*

***(прыкладна 2-3 старонкі)***

1. *сціслая характарыстыка аб'екта, прадмета даследавання;*
2. *актуальнасць тэмы;*
3. ***ствараецца гіпотэза****;*
4. *вызначаецца мэта і задачы даследавання;*
5. *робіцца агляд навуковых крыніц па тэме;*
6. *высвятленне ступені яе даследаванасці і навізны. Пажадана акрэсліць уласны падыход да распрацоўкі тэмы або праблемы, яе пэўных аспектаў, патлу-мачыць неабходнасць правядзення даследавання.*

## *ТЭАРЭТЫЧНАЯ ЧАСТКА*

***(прыкладна 4-6 старонак)***

1. *раскрываецца сутнасць асноўных літаратуразнаўчых ці моваэнаўчых паняццяў, якія выкарыстоўваюцца ў рабоце;*
2. *даецца агляд літаратуры па тэарэтычным пытанні даследавання;*
3. *па магчымасці, выяўляецца свой погляд на ўзнятае пытанне.*

## *АСНОЎНАЯ ЧАСТКА* *(15-20 старонак):*

1. *асноўная частка матэрыялу выкладаецца ў двух ці некалькіх раздзелах, падзел на якія павінен адбывацца ў лагічнай паслядоўнасці;*
2. *доказнае абгрунтаванне асноўных навуковых палажэнняў у ходзе літаратуразнаўчага (моваэнаўчага) аналізу павінна быць падпарадкавана мэце і задачам навуковага пошуку.*
3. *пры выкладанні матэрыялу неабходна рабіць спасылкі на аўтараў і крыніцу запазычання той ці іншай думкі;*

*4.вельмі важна, каб у кожным раздзеле былі пададзены вынікі самастойнага даследавання тэмы з пэўнымі ацэнкамі, уласнымі меркаваннямі, канстатацыяй зробленага і сціслымі высновамі.*

***ЗАКЛЮЧЭННЕ*** *(1-2 старонкі):*

*Заключэнне ўключае асноўныя вывады па тэме даследавання, якія павінны вызначацца навуковай аб'ектыўнасцю і глыбінёй.*

## *Раздзел "ЛІТАРАТУРА"*

*1. бібліяграфічны спіс складаецца з двух раздзелаў: "Спіс выкарыстаных крыніц" і "Даведачная літаратура";*
*2. бібліяграфія прыводзіцца напрыканцы работы і афармляецца ў адпаведнасці з агульнапрынятымі правіламі;*
*3. крыніцы размяшчаюцца ў алфавітным парадку паводле прозвішча аўтара ці назвы выдання, пры гэтым пералік даецца ў суцэльнай нумарацыі;*
*4. спіс выкарыстанай літаратуры павінен змяшчаць не менш за 20—25 крыніц, уключаючы выкарыстаныя выданні мастацкіх тэкстаў, слоўнікі.*

***РАБОТА З ЛІТАРАТУРНЫМІ КРЫНІЦАМІ***

| № | Этапы работы | Змест этапаў |
|---|---|---|
| 1 | Агульнае знаёмства | Знаёмства са зместам. Прагляд літаратурнай крыніцы |
| 2 | Уважлівае чытанне па главах і раздзелах | Выдзяленне найбольш важнага тэксту |
| 3 | Выбарачнае чытанне | Перачытванне найбольш важнага тэксту |
| 4 | Складанне плана, прачытанага матэрыяла | У пунктах плана адлюстроўваецца найбольш важкая думка |
| 5 | Выпіскі з прачытанага | Дакладныя і поўныя цытаты (цытата+бібліяграфічнае апісанне) |
| 6 | Параўнанне і супастаўленне прачытанага з іншымі крыніцамі | Адзначаецца агульнае і living рознае ў рашэнні праблемы |
| 7 | Крытычная ацэнка прачытанага і запіс заўваг | Звяртаецца ўвага на аб'ектыўнасць меркаванняў |

***АФАРМЛЕННЕ ЛІТАРАТУРЫ:***

***Адзін, два або тры аўтары***

*Дудараў, А. Князь Вітаўт: п’есы / А. Дудараў. — Мінск: Маст. літ., 2005.— 318 с.*
*Мішчанчук, М. І. Беларуская літаратура XX стагоддзя / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. — Мінск: Вышэйш. шк., 2001. — 352 с.*

***Чатыры і больш аўтараў***

*Культурология : учеб. пособие для вузов /*
*С. В. Лапина [и др.]; под общ. ред.*
*С. В. Лапиной. — 2-е изд. — Минск: ТетраСистемс, 2004. — 495 с.*

***Калектыўны аўтар***

*Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду! : успаміны, інтэрв’ю, эсэ / уклад.*
*Г. Шаблінскай. — Мінск : Маст. літ., 2005. — 518 с.*

*Беларускі фальклор : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2005. — Т. 1: Акапэла — Куцця. — 768 с.*

***Шматтомнае выданне***

*Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 1999—2003. — Т. 1: 1901—1920 / Л. Я. Гаранін [і інш.]. — 1999. — 583 с: Т. 4, кн. 1 : 1966—1985 / С. А. Андраюк [і інш.]. — 2002. — 928 с.*

*Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. — Мінск : Маст. літ., 1995—2003. —9 т.*

***Асобны том у шматтомным выданні***

*Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. — 2-е выд. — Мінск : Беларус. навука, 2001.— Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. — 751 с.*

***Зборнікі артыкулаў, навуковых прац***

*Творчая асоба І. Навуменкі і праблемы беларускай філалогіі і адукацыі : зб. навук. арт. / рэдкал.: Т. І. Шамякіна (гал. рэд.) [і інш.]; уклад. А. І. Бельскі. — Мінск : РІВШ, 2006. — 336 с.*

***Матэрыялы канферэнцый***

*Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 26—27 крас. 2006 г. / Мін-ва адук. Рэсп. Беларусь, Магілёўс. дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова; рэдкал.:*
*А. М. Макарэвіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2006. — 322 с.*
*Вучэбна-метадычныя матэрыялы*

*Лойка, А. А. Роўнакутны трохвугольнік, або Ад Палямона да Максіма Танка : дапам. па спецкурсе “Беларуска-руска-польскія літаратурныя сувязі” /*
*А. А. Лойка: Беларус. дзярж. ун-т, філал. ф-т. — Мінск, 2003. — 214 с.*

***Раздзел з кнігі***

*Лойка, А. А. Максім Гарэцкі / А. А. Лойка // Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. /*
*А. А. Лойка. — 2-е выд., дапрац. і дап. — Мінск : Вышэйш. шк., 1989. — Ч. 2. — Раздз. 8. — С. 364—392.*

***Артыкул з часопіса***

*Яцухна, В. Незапатрабавальны рэзерв / В. Яцухна // Тэатральная Беларусь. – 1992. – №5. – С. 39 – 41.*

***Артыкул з газеты***

*Галубовіч, Л. Учарашняе сённяшняе / Л. Галубовіч // ЛіМ. — 2006. — 4 жн. — С. 6.*

***Артыкул з энцыклапедыі, слоўніка***

*Шыкунова, Э. В. Экспрэсіянізм / Э. В. Шыкунова // Беларус. энцыкл. : у 18 т. — Мінск : БелЭн, 2004. — Т. 18, кн. 1. — С. 78.*

## *ДАДАТКІ*

***Дадаткі –*** *гэта частка тэксту навуковага даследавання, якая мае дадатковае значэнне, неабходнае для больш поўнага асвятлення тэмы (А, Б, В і г.д.).*

*- тэксты;*
*- вынікі апытання;*
*- карты;*
*- табліцы;*
*- графікі;*
*- копіі дакументаў;*
*- статыстычныя матэрыялы...*

***Пытанне: “З якімі творамі В. Быкава вы знаёмы?”***

1. *“Абеліск”;*
2. *“Аблава”;*
3. *“Жураўліны крык”;*
4. *“Знак бяды”;*
5. *“Незагойная рана”;*
6. *“Сваякі”;*
7. *“Сотнікаў”.*




## *АФАРМЛЕННЕ*

1. *Тытульны ліст*
2. *Змест*
3. *Асноўны тэкст*
4. *Спасылкі і іх афармленне*

***ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ***

***Аддзел адукацыі Добрушскага райвыканкама***

***ДУА “Гімназія г.Добруша”***

***БАЛАДЫ А.МІЦКЕВІЧА, Я.ЧАЧОТА І ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКАЯ БАЛАДНАЯ ТРАДЫЦЫЯ.***

*(Баллады А.Мицкевича, Я.Чачота и западноевропейская балладная традиция)*

*Секция: белорусская филология (белорусская литература)*

***Автор:*** *Адзерихо Мария,*
*ГУО “Гимназия г.Добруша”, 9 “А”,*
*ул. Артеллерийская д 1,*
*т. д. 31609*

***Научный руководитель:***

*Копач Елена Николаевна, ГУО “Гимназия г. Добруша”, учитель белорусского языка и литературы*

*Добруш, 2011*

## *ЗМЕСТ*

***Да тэмы “Класічныя жанры лірыкі ў творчасці М.Багдановіча ”***

*1.Уводзіны*
*2.Жанры лірыкі ў творчасці М. Багдановіча*
*3.Да пытання пра жанры лірыкі*
*4.“Цвёрдыя формы” вершаў*
*5.Заключэнне*
*6.Літаратура*

## *АСНОЎНЫ ТЭКСТ*

*1.Тэкст работы афармляеццаў адпаведнасці з прынятымі стандартамі. Памер шрыфту тыпу Times New Roman — 14, міжрадковы інтэрвал — 1.*
*2. Неабходна вытрымліваць памеры палёў: верхняга і ніжняга — **20** мм, левага — **20** мм, правага — **15** мм.*
*3. Кожную структурную частку работы неабходна пачынаць з новай старонкі. Загалоўкі (назвы) структурных частак друкуюцца па цэнтры радка. Кропка ў канцы загалоўка не ставіцца.*
*4. Старонкі работы нумаруюцца арабскімі лічбамі. Першай старонкай работы з'яўляецца тытул, які залічваецца ў агульную колькасць старонак.*
*5. Усяго **30** старонак (уключаючы дадаткі)*

## *СПАСЫЛКІ І ІХ АФАРМЛЕННЕ*

*Спасылкі могуць афармляцца 2 шляхамі:*
*1. непасрэдна ў канцы старонкі:*
*[1] Русецкі, А. Уладзімір Караткевія: праз гісторыю ў сучаснасць:Нататкі літ.творчасці. / А. Русецкі. – Мінск: Маст.літ., 2000. – 300 с.2. у “Літаратуры”, а ў тэксце з дапамогай наступных сімвалаў [12, с.51].*

## *СКЛАДАННЕ ТЭЗІСАЎ*

1. *мэта;*
2. *задачы;*
3. *агульны агляд літаратуры;*
4. *выкарыстаныя падыходы;*
5. *вынікі;*
6. *перспектывы далейшага даследавання.*

## *Артыкул*

***БАЛАДЫ А.МІЦКЕВІЧА, Я.ЧАЧОТА І ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКАЯ БАЛАДНАЯ ТРАДЫЦЫЯ***

*Авторы:*
*Научный руководитель:*
*Поўная назва ўстановы адукацыі:*
*(Далей сцісла выкладаюцца асноўныя метады даследавання, называюцца вывады па працы).*

## *Спіс літаратуры*

***Афармленне артыкула***
*Максімум – 3 старонкі*
*"Таймс", 14 пт,*
*Абзац – 1, 25*
*Палі – 2 см (з усіх бакоў)*
*Нумары старонак*
*Загаловак аддзяляецца ад тэксту 3 інтэрваламі зверху і знізу*

## *ВУСНАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ*

*у выступленні (5–7 хвілін) раскрываюцца:*
- *актуальнасць тэмы,*
- *мэта,*
- *задачы, якія вырашаліся ў працэсе літаратуразнаўчага (мовазнаўчага) аналізу,*
- *змест,*
- *вынікі даследавання;*

***!!!*** *могуць быць зададзены пытанні па тэме работы.*

*Пажадана мець **рэцэнзію**, дзе даецца агульная характарыстыка работы, пры гэтым рэцэнзент*
- ☐ *ацэньвае ўзровень і якасць праведзенага даследавання,*
- ☐ *адзначае вартасці,*
- ☐ *вызначае слабыя бакі даследавання.*

| "Завучанае" маўленне | Імправізацыя |
|---|---|
| Станоўчыя бакі:<br>- Лагічнасць і паслядоўнасць выкладу інфармацыі<br>- прадуманая структура выступлення<br>Адмоўныя бакі:<br>- стрэс – як вынік – страх забыцца вывучаны тэкст<br>- немагчымасць хутка рэагаваць на аўдыторыю | Станоўчыя бакі:<br>- Магчымасць усталяваць кантакт з аўдыторыяй<br>Адмоўныя бакі:<br>-як правіла, адсутнасць прадуманай структуры выступлення<br>- залішняя эмацыянальнасць |

**!!! Неабходна ўлічваць асобасныя характарыстыкі аратара пры падрыхтоўцы прамовы**

## Уводзіны

Ва ***Уводзінах*** неабходна прыцягнуць увагу слухачоў, прабудзіць цікавасць, заваяваць давер (усталяваць кантакт, узаемаразуменне са слухачамі).

Уводзіны складаюцца з :
- мэты і задач работы,
- актуальнасці,
- асноўных палажэнняў, якія выносяцца на абарону.

**!!! Тут <u>не варта</u> спыняцца на аглядзе літаратуры і крыніцах. Па іх часцей за ўсё задаюцца пытанні.**
**(**Прыкладна 1 старонка**)**

## Асноўная частка

- Сутнасць і вынікі даследавання,
- Акцэнт на новай інфармацыі, атрыманай у ходзе навуковага пошуку,
- Увага перспектывам далейшага развіцця тэмы.

(Прыкладна 3 старонкі)

## Заключэнне

У ***заключэнні*** :
- нагадаць галоўнае,
- падвесці вынік ужо сказанага,
- заклікаць да дзеяння,
- даць ў скарочаным выглядзе вынікі і рэкамендацыі па практычным выкарыстанні праведзенай працы.

(Прыкладна 1 старонка)

**Магчымыя прыёмы пабудовы Уводзін і Заключэння**

- ☐ аб’яўленне тэмы выказвання;
- ☐ прамое падкрэсліванне значэнне тэмы (яе актуальнасці, навізны, практычнай значнасці);
- ☐ тлумачэнне прычын цікавасці прамоўцы да дадзенай тэмы;
- ☐ выдзяленне ключавога тэрміна;
- ☐ пастаноўка мэты выступлення;
- ☐ знаёмства слухачоў з планам выступлення;
- ☐ яркі, вызначальны прыклад;
- ☐ сюжэтны пачатак (жыццёвая гісторыя, байка, прытча, легенда і г.д.)
- ☐ гумарыстычная, сатырычная, іранічная заўвага;
- ☐ цытата;
- ☐ прымаўка ці прыказка, якая мае непасрэдныя адносіны да тэмы выказвання.
- ☐ рытарычнае пытанне ці пытанні пытальна-адказнага ходу

## Адказы на пытанні

*“Дзякую за пытанне,*

*а). мой адказ______*
*б). У мяне, на жаль, няма адказу, паколькі разгляд гэтага пытання не ўваходзіў у межы майго даследавання"*
*2. "Дзякую, Ваша пытанне зразумела ______"*
*3. "Прабачце, я не зразумеў(-ла) пытання. Паўтарыце яго, калі ласка!"*
*4. "Ці правільна я разумею, што зададзенае пытанне: "_________________?"*
*5. "Адказ на зададзенае пытанне патрабуе дастаткова падрабязнага тлумачэння, калі на гэта будзе выдзелены час, то я гатовы (ва) адказаць".*

## Завяршэнне дыскусіі

**Удзячнасць за цікавасць да тэмы даследавання і за прапанаваныя пытанні**
*"Дзякую за праяўленую цікавасць да тэмы, праведзенага мною даследавання. Усяго найлепшага"*
!!! Пры адказе на пытанні пазбягайце:
- залішняй катэгарычнасці;
- шматслоўнасці.

**Распаўсюджаныя пытанні членаў камісіі:**

- ☐ Назавіце спосабы (метады, прыёмы) даследавання, якімі Вы карысталіся?
- ☐ Хто з вядомых даследчыкаў звяртаў увагу на гэта пытанне?
- ☐ Што новага для сябе Вы даведаліся, займаючыся гэтай тэмай?

## Прыкладны план выступлення

| № | Пункты | Варыянты |
|---|---|---|
| 1. | **Прывітанне** | *"Добры дзень, паважаны кіраўнік канферэнцыі, паважаныя члены камісіі і прысутныя!"* |
| 2. | **Прадстаўленне (прозвішча, імя, клас, навучальная ўстанова, горад)** | *"Мяне завуць ____________. Я вучань (-ца) ____ класа, гімназіі (школы), __ горада ____________"* |
| 3. | **Мэта выступлення** | *"Мэтай майго выступлення з'яўляецца даць новую інфармацыю па тэме праведзенага мною даследавання ў галіне _________"* |
| 4. | **Назва тэмы даследавання** | *"Назва тэмы: ___________________"*<br>*"Тэма майго даследавання - ________"* |

| | | |
|---|---|---|
| 5. | **Актуальнасць даследавання (абаснаванне выбару тэмы)** | *“Актуальнасць і выбар тэмы даследавання вызначаны наступнымі фактамі:*<br>*па-першае, ______________________________,*<br>*па-другое, ________________________________,*<br>*па-трэцяе, _______________________________”.* |
| 6. | **Мэта даследавання і спосабы яе дасягнення** | *“Мэта майго даследавання - ______________”.*<br>*Асноўныя задачы даследавання і спосабы іх вырашэння:*<br>*1. ________________________,*<br>*2. ________________________,*<br>*3. ________________________.* |
| 7. | **Сцісла пра новыя вынікі ў ходзе даследавання** | *“У ходзе правядзення даследавання атрыманы наступныя тэарэтычныя і (ці) практычныя вынікі:*<br>*1. Атрыманы новыя веды наступнага характару__________________________,*<br>*2. Пастаўлены новыя гіпотэзы і ідэі _____,*<br>*3. Вызначаны новыя праблемы (задачы)___________________”.* |
| 8. | **Вынікі па правядзенні даследавання** | *“На аснове праведзенага даследавання і атрыманых вынікаў можна зрабіць наступныя высновы:*<br>*1. _____________________________,*<br>*2. _____________________________,*<br>*3. _____________________________”.* |
| 9 | **Сцісла пра наступныя крокі па тэме праведзенага даследавання** | *“Лічу, што дадзеная тэма мае перспектывы развіцця ў наступных накірунках:*<br>*1. ______________________________,*<br>*2. ______________________________,*<br>*3. ______________________________”.* |
| 10. | **Удзячнасць за ўвагу** | *“Дзякую за праяўленую цікавасць да тэмы майго выступлення”.* |

**Складанне мультымедыйнай прэзентацыі па тэме даследавання (паказ прэзентацыі).**

☐ На слайды выносяцца азначэнні, тэрміны, матэрыялы, якія маюць прынцыповае значэнне для прадстаўлення даследавання.

☐ Графікі, малюнкі, дыяграмы, фотаздымкі і іншыя ілюстрацыйныя матэрыялы павінны, па магчымасці, максімальна запаўняць поле экрана.

☐ Выбар *колеравага афармлення фону слайдаў*. Трэба выбіраць спакойныя адценні, якія не выклікаюць стамлення вачэй і не раздражняюць іх.

☐ Гукавое суправаджэнне слайдаў, калі яно ёсць, не павінна насіць рэзкі, раздражняльны характар.

☐ Мультымедыйную прэзентацыю варта настроіць па часе, што дазваляе пераканацца ў тым, ці вытрымліваеце вы адведзены рэгламент.

## Чаго нельга рабіць

1. чытаць слайды;
2. "перагружаць" слайды;
3. выкарыстоўваць розны фармат прэзентацыі;
4. адварочвацца спінай да аўдыторыі;
5. расслабляцца пад час пытанняў.

## СКЛАДАННЕ ПРЭЗЕНТАЦЫІ

☐ прыкладна 10-15 слайдаў (можа быць і менш 10);
☐ На слайдзе павінна змяшчацца максімум
20 – 25 слоў, каб інфармацыя магла добра ўспрымацца;
Не злоўжываце малюнкамі і фотаздымкамі
☐ **Першы слайд**. Назва вучэбнай установы, назва работы, аўтар (-ы) і кіраўнік;
☐ **2-4 слайд**. *Метадалогія работы* (мэта, задачы, прадмет, аб'ект, актуальнасць);
☐ **5-6 слайд**. Вынікі анкетавання (калі праводзілася), але не больш трох слайдаў;
☐ **7-8 слайд.** Змест працы;
☐ **9-11 слайд.** Вынікі па раздзелах;
☐ **12 слайд.** Практычная значнасць працы;
☐ **13-14 слайд.** Вынікі працы;
☐ **15 слайд.** Дзякуй за ўвагу!

## РАСПАЎСЮДЖАНЫЯ ПАМЫЛКІ ПРЫ АБАРОНЕ ДАСЛЕДЧЫЦКІХ ПРАЦ

☐ безэмацыянальнае суцэльнае чытанне тэксту даклада
☐ шмат тэксту на слайдзе; слайд цалкам паўтарае тэкст;
☐ немагчымасць тлумачэння навуковых тэрмінаў, ужытых ў працы;
☐ ***недапушчальны*** выклад матэрыялу двума ці больш дакладчыкамі (на пытанні адказваць могуць усе, хто рыхтаваў работу, калі работа - калектыўная);
☐ парушэнне рэгламенту;

☐ **!!!!!** Яшчэ раз пра культуру паводзін пры адказе на пытанні. Захоўваем ветлівасць і карэктнасць у адносінах да калег.
☐ неадпаведнасць фармальным патрабавання конкурсу, выкладзеным ў Палажэнні;
☐ тэма для даследавання сфармулявана занадта шырока;
☐ у работах не прадстаўляецца агляд літаратуры, якая існуе па тэме даследавання;
☐ мэта (адна), а **не некалькі**;
☐ сярод метадаў памылкова называюць (даследаванне, аналіз, сістэматызацыю);
☐ неадпаведнасць высноў і задач даследавання;
☐ **метадалагічная база** даследвання не вызначана;
☐ непаўната даследвання, аднабаковае прадстаўленне і разгляд матэрыялу;
☐ парушэнне лагічнасці;
☐ слабасць доказаў, адсутнасць дакладнасці абгрунтаванняў і доказаў;
☐ рэфератыўна-кампілятыўны характар асобных работ;
☐ невыкарыстанне спасылак пры цытаванні **першакрыніц**;
☐ адступленне (або замена) навуковага стылю падачы матэрыялу;
☐ афармленне бібліяграфічнага спісу выкарыстанай літаратуры з памылкамі.

## РЭЦЭНЗІЯ

на навуковую работу вучня 8 "А" класа сярэдняй школы №2 г.Добруша **Іванова Андрэя Іванавіча**
"Паэтыка рамантызму ў аповесці
У.Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха"

**РЭЦЭНЗІЯ**

Сваёй працай А.І. Іваноў пераканаўча засведчыў, што творчая манера У.Караткевіча грунтуецца на прынцыпах і пастулатах рамантычнага светаадчування.

У гэтым яму найперш дапамаглі працы папярэднікаў-літаратуразнаўцаў, а таксама – і ўласны аналіз творчасці У.Караткевіча.

А.І. Іваноў удумліва прааналізаваў аповесць У.Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха". Ва "Уступе" адзначаецца ўклад пісьменніка ў пашырэнне праблемна-тэматычных абсягаў сучаснай беларускай літаратуры, даецца агляд крытычнай літаратуры па творчасці пісьменніка, вызначаюцца мэты і задачы даследавання.

У першым раздзеле "Рамантызм і рэалізм у творчасці У.Караткевіча" Андрэй Іванавіч эскізна вызначае вытокі рамантызму, яго светапогляднай, філасофскай, ідэйнай і стылёвай спецыфікі, вядзе гаворку пра рамантызм і рэалізм у творах У.Караткевіча.

Падрабязна, сістэмна, удумліва, самастойна прааналізаваны ў працы ідэі і вобразы аповесці "Дзікае паляванне". У раздзеле ахарактарызаваны не толькі героі твора, але і праблематыка, роздум пісьменніка пра патрыятызм, повязь часоў, здраду і пакаранне, сэнс жыцця і інш.

Паспяхова разгледжана ў працы А.Іванова адметнасць пейзажу, выяўленне рамантычнага светапогляду У.Караткевіча ў апісанні прыродных з'яў, а таксама – псіхалагічная напоўненасць партрэтаў герояў, сімволікі імён і інш.

У канцы работы зроблены лаканічныя вывады.

Рэкамендую гэтую працу для абароны на навукова-даследчай канферэнцыі школьнікаў як адметны і несумненна перспектыўны плён маладога даследчыка. Прапанаваная праца – шчырая,

старанная работа маладога даследчыка, якая пры належай абароне, можа быць ацэнена на “выдатна”.

**АЦЭНКА РАБОТЫ**

Ацэньванне работы звычайна адбываецца па 10-бальнай шкале.

**I. Структура**

1) уводзіны ( пастаноўка мэты і задач, актуальнасць тэмы);
2) асноўная частка (метады і апісанне даследавання);
3) заключэнне;
4) дадаткі, спіс выкарастанай літаратуры.

**II. Даследчыцкі характар работы**

1) аналітычныя выкладкі;
2) вынікі эксперыменту;
3) гіпотэзы.

**III**

- ☐ самастойнасць даследавання;
- ☐ рэпрэзентатыўнасць (фактычная падмацаванасць даследавання);
- ☐ пісьменны і лагічны выклад матэрыялу;
- ☐ глыбіня валодання;
- ☐ рэгламент (да 10 хвілін);
- ☐ афармленне;
- ☐ ацэнка абароны.

## Літаратура ў дапамогу:


1. Драбеня, Ф. В. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і правядзенні гуртка “Малады даследчык” / Ф. В. Драбеня // **Столичное образование сегодня**. – 2007 – №2 . – С. 114 – 123.
2. Факультатыў для XI класа “Малады даследчык”, зацверджаны Нацыянальным інстытутам адукацыі.
3. Былінская, Л.С. Фарміраванне даследчых кампетэнцый вучняў / Л.С.Былінская // *Роднае слова*. – 2008. – №2 – С. 78 – 82.
4. Артыкулы ў часопісе “Адукацыя і выхаванне” №1 за 2008 год.
5. Запрудский Н.И., Добриневская А.И. Организация факуль-тативных занятий в 11-летней школе/ Н.И. Запрудский, А.И. Добриневская. – Минск: Зорны верасень, 2008 – 164 с.
6. Зачесова, Е.В. Представление результатов исследований школьников / Е. В. Зачесова // *Школьные технологии*. – 2006. – №4. – С. 115 – 122.
7. Зачесова, Е.В. Написание текстов: рекомендации юным авторам учебных исследований и их руководителям / Е. В. Зачесова // *Школьные технологии*. – 2006. – №5. – С. 105 – 111.
8. Тяглова, Е.В. Методика апробации результатов исследовательской деятельности учащихся / Е.В. Тяглова // *Школьные технологии.* – 2007. – №1. – С. 105 -111